РОСТ КУЛЬТУРЫ

Хто памятае, як выглядала бібліятэка імя Леніна ў 1946 годзе, таму асабліва кідаюцца ў вочы тыя змены, якія адбыліся за чатыры гады. Нават на прыкладзе нашай бібліятэкі мы ўбачым, што гэта іменна так. Дамо слова лічбам: у 1946 годзе агульная плошча, якую займала наша бібліятэка, раўнялася 120 квадратным метрам, сёння яна — 300. У 1946 годзе бібліятэка мела ўсяго 50.448 экземпляраў кніг. У 1949 — 125.365. У 1946 годзе на патрэбы бібліятэкі было асігнавана 263 тысячы рублёў, у 1949 годзе адпушчана 400 тысяч. Больш чым на паўтары тысячы павялічыўся лік чытачоў. Кніга пераварылася ў сябра жыхара нашага горада. Непамерна ўзрос попыт на кнігі класікаў марксізма-ленінізма, бо ў гэтых кнігах, у творах найвыдатных карыфеяў навукі чытач знаходзіць адказ на ўсе хвалюючыя яго пытанні. За апошні год было выдана на рускай мове чытачам 18.590 кніг Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, больш 33 тысяч кніг па прыродазнаўству, матэматыцы, сельскай гаспадарцы. Чытачы нашай бібліятэкі за апошні год прачыталі звыш 100 тысяч кніг мастацкай літаратуры.

Так, дзякуючы клопатам вялікага Сталіна, камуністычнай партыі расце культура працоўных нашага горада.

Г. ЗАЙЦАЎ,
дырэктар бібліятэкі імя Леніна.